*Ю. А. Пераверзева,*
*кандыдат педагагічных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# МЭТАВЫЯ ПРАГРАМЫ І ПРАЕКТЫ Ў ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК ПА ЗАХАВАННІ І РАЗВІЦЦІ КНІЖНАЙ КУЛЬТУРЫ

У дзейнасці сучасных бібліятэк па захаванні і развіцці кніжнай культуры асаблівая ўвага надаецца распрацоўцы мэтавых праграм і праектаў. Яны ўяўляюць сабой комплексныя складана структурыраваныя дакументы, у якіх знаходзяць адлюстраванне сацыяльна-эканамічны стан бібліятэчнай установы, формы і метады яе работы, функцыі, прафесійныя характарыстыкі кіраўнікоў і спецыялістаў і інш. [4].

Мэтавыя праграмы і праекты дазваляюць сканцэнтраваць увагу на пэўных праблемах функцыянавання бібліятэкі як культурна-асветнага цэнтра, дзейнасць якога прадугледжвае пашырэнне сфер узаемадзеяння з грамадствам: ад традыцыйных форм супрацоўніцтва (культурна-дасугавыя масавыя мерапрыемствы, выставы, творчыя сустрэчы і інш.) да інавацыйных (рэпазіторыі, віртуальныя даведачныя службы, электронная дастаўка дакументаў і г.д.).

Мэтавыя праграмы і праекты – складнікі даволі разгалінаванай праектнай дзейнасці – кірунку бібліятэчнай работы, які разглядаецца як: 1) форма творчасці і прафесійнага самаўдасканалення бібліятэкараў; 2) сродак сацыякультурнай камунікацыі; 3) спосаб трансляцыі вынікаў бібліятэчнай дзейнасці ў знешняе асяроддзе.

Бібліятэказнаўчая навука выпрацавала пэўныя падыходы да вызначэння паняційнага апарату, прыкмет класіфікацыі, структуры і зместу праектнай дзейнасці, умоў яе ажыццяўлення. Навукоўцы і бібліятэкары-практыкі вывучаюць праектаванне як:

– сацыякультурную з’яву, для якой характэрна пераўтварэнне рэчаіснасці і асваенне свету сродкамі праектных тэхналогій;

– спецыфічную сацыяльную тэхналогію, арыентаваную на інтэграцыю гуманітарных ведаў у працэс выпрацоўкі варыянтных узораў рашэнняў бягучых і перспектыўных сацыяльна значных праблем з улікам даных сацыяльна-дыягнастычных даследаванняў і даступных рэсурсаў;

– кіраўніцкую з’яву, дзе мэтавая праграма і праект – спосабы кіравання бібліятэкай (структурным падраздзяленнем), якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ствараюць самастойную праграмна-мэтавую арганізацыйную структуру;

– маркетынгавую з'яву, мэтай якой з'яўляецца прасоўванне і пазіцыянаванне бібліятэкі ў грамадстве, стварэнне гнуткіх мадэляў прасоўвання бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг на інфармацыйны рынак, прыцягненне новых карыстальнікаў і партнёраў. Пры гэтым выкарыстанне PR у паўсядзённай рабоце бібліятэк і пры рэалізацыі мэтавых праграм і праектаў насычае інфармацыяй грамадскае асяроддзе, павышае атрактыўнасць мерапрыемстваў, якія маюць дачыненне да ўкаранення вынікаў праектавання;

– педагагічную тэхналогію, якая рэалізуецца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў, у тым ліку праз рэгламентаванае і нерэгламентаванае навучанне [1; 4; 5].

Незалежна ад кантэксту ўжывання ў практыцы работы бібліятэк праграмна-мэтавых тэхналогій агульная мэта бібліятэчнага праектавання заключаецца ў дасягненні якасных і эфектыўных вынікаў прафесійнай дзейнасці, накіраваных на ўдасканаленне бібліятэчнага асяроддзя ў матэрыяльным і сацыяльна-грамадскім сэнсах.

Як паказвае вопыт работы айчынных бібліятэк, прыярытэтным кірункам праграмна-мэтавай дзейнасці з'яўляецца захаванне кніжнай культуры і рэгіянальных сацыякультурных традыцый. Як адзначае Л.Г.Кірухіна, гэта вынікае з іх сутнаснай функцыі, якая заключаецца ў захаванні дакументальнай культурнай спадчыны і забеспячэнні яе выкарыстання грамадствам. Бібліятэчныя фонды разглядаюцца як адно з асноўных доўгатэрміновых сховішчаў сацыяльнай памяці. Менавіта ў іх сканцэнтраваны ўсе веды, здабытыя чалавецтвам з часу з'яўлення пісьменства. Бібліятэкі не толькі захоўваюць гэтыя каштоўнасці, але і робяць іх даступнымі кожнаму чалавеку і ўжо гэтым здзяйсняюць іх апасродкаваную трансляцыю ў грамадства [2, с. 7–8].

Бібліятэкі краіны будуюць сваю праграмна-мэтавую дзейнасць па захаванні і развіцці кніжнай культуры ў адпаведнасці з міжнароднымі і айчыннымі нарматыўнымі актамі і праграмамі: міжнародная Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, законы Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» і «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады і г.д.

Выкарыстоўваюцца таксама і метадычныя матэрыялы. Першае метадычнае выданне, прысвечанае распрацоўцы мэтавых праграм і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праектаў, было надрукавана ў 1999 г. Яно створана калектывам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і ахоплівае такія аспекты, як методыка і правілы падрыхтоўкі мэтавых комплексных праграм, асобных бібліятэчных праектаў, этапы, звязаныя з афармленнем заявак на гранты [3]. З цягам часу бібліятэкі розных тыпаў выпрацавалі ўласныя рэкамендацыі па складанні разглядаемых дакументаў, але, на жаль, большасць з іх мае статус рукапісу. У іх выразна прасочваецца арыентацыя на светапоглядную ўстаноўку праекціроўшчыка, яго самавызначэнне ў адносінах да аб’екта праектнай дзейнасці, які ў выніку павінен атрымаць развіццё, зберажэнне, змяненне.

У той жа час праца бібліятэкараў у галіне мэтавага фінансавання патрабуе перагляду арганізацыйнай структуры бібліятэк, прыцягнення да вырашэння праблем, звязаных з фінансаваннем, папячыцельскіх саветаў і суполак «Сябры бібліятэк», распрацоўкі пытанняў кіравання фінансавымі рэсурсамі, функцый і метадаў кіравання, павышэння карпаратыўнай культуры, адказнасці за якасць выкананых работ, выкарыстання інавацыйных форм абслугоўвання карыстальнікаў, уключэння бібліятэк у рэспубліканскія, рэгіянальныя праграмы развіцця розных галін жыццядзейнасці.

Праектаванне рэалізуецца праз узаемадзеянне беларускіх бібліятэк з прадстаўніцтвамі замежных краін і дыпламатычным корпусам па правядзенні міжнародных культурных акцый: «Міжнародны дзень роднай мовы», «Міжнародны дзень аўтарскага права», «Міжнародны дзень культурнай разнастайнасці».

З мэтай папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры і забеспячэння доступу да лепшых твораў беларускай літаратурнай класікі Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі быў рэалізаваны праект «Літаратурная спадчына Беларусі: XI – сяр. XX ст.», таксама бібліятэка стала ўдзельніцай міждзяржаўнага расійска-беларускага бібліятэчнага праекта «Сокровища славянской культуры», накіраванага на захаванне дакументальнай і культурнай спадчыны дзвюх краін і прадастаўленне свабоднага доступу да электронных копій помнікаў кніжнай культуры Расіі і Беларусі.

На базе інфармацыйнага цэнтра Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі функцыянуе Бібліятэка па ўстойлівым развіцці, адкрытая па ініцыятыве кіраўніцтва праекта Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года. Згодна з гэтай праграмай адбываецца інфармаванне карыстальнікаў пра інфармацыйныя рэсурсы, забяспечваецца доступ да інфармацыі, у тым ліку ў аддаленым рэжыме, вядзецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тлумачальная работа па павышэнні інтарэсу грамадскасці да праблем экалагічнага, сацыяльнага дабрабыту, захавання нацыянальнай спадчыны.

Такім чынам, арганізацыі дзейнасці ў галіне рэалізацыі мэтавых праграм і праектаў садзейнічае ўключэнне бібліятэк у сацыяльна-культурную сферу рэгіёна. Гэта дзейнасць патрабуе адаптацыі бібліятэк да знешніх сацыяльных і эканамічных умоў, уліку прыярытэтных кірункаў развіцця навукі, тэхнікі, культуры. Змест мэтавых праграм і праектаў ахоплівае пытанні стварэння, распаўсюджвання і забеспячэння доступу да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк.

Змест праграмна-мэтавай дзейнасці аказвае ўплыў на трансфармацыю асноўных функцый бібліятэк. У гэтым кантэксце культурна-асветніцкая функцыя выяўляецца ў адлюстраванні інфармацыйных рэсурсаў па гісторыі, культуры, мастацтве пэўнага рэгіёна, што садзейнічае павышэнню ўвагі грамадскасці да праблем зберажэння і адраджэння нацыянальнай кніжнай культуры. У стварэнні ўласных бібліяграфічных, электронных рэсурсаў, баз даных гістарычнага, краязнаўчага характару праяўляецца інфармацыйная функцыя бібліятэк. Рэалізацыя адукацыйнай функцыі бібліятэк сродкамі мэтавых праграм і праектаў забяспечваецца выкарыстаннем як традыцыйных, так і інтэрактыўных форм прадастаўлення інфармацыі і стварэння магчымасці навучання, перападрыхтоўкі, засваення новых ведаў усімі катэгорыямі карыстальнікаў.

Праграмна-мэтавая дзейнасць бібліятэк, накіраваная на развіццё культурнага патэнцыялу і захаванне кніжнай культуры, стварае аснову для пашырэння сістэмы сацыяльнага партнёрства, рэарганізацыі і мадэрнізацыі бібліятэк і, як вынік, прыцягнення пазабюджэтных рэсурсаў для ажыццяўлення гэтых працэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Веренич, М. И.* Социально-культурное проектирование как технологическая основа профессиональной деятельности в арт-менеджменте / М. И. Веренич // Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13–14 ліст. 2008 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал. : Н. А. Ляйко (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 87–94.

2. *Кірухіна, Л. Г.* Самабытная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метадычны аспект / Л. Г. Кірухіна. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2005. – 75 с.

3. *Мэтавыя* бібліятэчныя праграмы і праекты : метад. рэкаменд. па распрац. / склад. Г. А. Злотнікава, Г. К. Кулага, Т. І. Папова. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 1999. – 23 с.

4. *Переверзева, Ю. А.* Социально-педагогические основы библиотечного фандрейзинга : автореф. дис. … канд. пед. наук : 05.25.03 – библиотековедение, библиографоведение и книговедение / Ю. А. Переверзева. – Минск, 2011. – 26 с.

5. *Суслова, И. М.* Проектная деятельность библиотек : науч.-практ. пособие / И. М. Суслова, З. И. Злотникова. – М. : Гранд : Фаир-пресс, 2005. – 176 с.– (Специальный издательский проект для библиотек).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ